2

ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЕЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 163 (1432) ПЯТНІЦА, 17 ліпеня 1931 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менгаркому ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . . 3 р. 60 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ I.

Кошт асобнага № 2—кап.

Распачаў працу кантрольны пленум ЦК ЛКСМБ

Учора а 7 гадзіне ўвечары, у клюбе імя Леніна адчыніўся кантрольны пленум ЦК ЛКСМБ.

Пленум заслухаў даклад тав. Гуткіна аб выкананьні рашэньняў IX і X зьездаў комсамолу аб ператварэньні комсамолу ў шматмільённы.

Дэлегацыя рабочай моладзі друкарні імя Сталіна вітаючы пленум рапартавала аб поўным уцягненьні ў комсамол усяе рабочае моладзі друкарні.

Сёньня зранку пачаліся спрэчкі па дакладу тав. Гуткіна.

Да 2-га ўсебеларускага зьлёту юных піонэраў

ПЕРАТВАРЭНЬНЕ ЗЬМЕНЫ У ШМАТМІЛЬЕННУЮ— БАЯВАЯ ЗАДАЧА ЛКСМБ

ПАДРЫХТАВАЦЬ ШМАТМІЛЬЁННУЮ АРМІЮ

Сучасная паласа ў разьвіцьці саюзу характэрна ўсё ўзрастаючым уздымам актыўнасьці мас комсамольцаў і працоўнай моладзі.

Ленінскі комсамол, які пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі, узяпчаў рашаючымі посьпехамі социялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва, які зараз упарта змагаецца за выкананьне програм 3-га рашаючага году пяцігодкі, году завяршэньня пабудовы фундаманту социялістычнай экономікі,—ператвараецца зараз у шматмільённую організацыю.

Кожны дзень у слаўныя загартаваныя ў клясавых бойках рады ленінскага комсамолу толькі па Беларусі ўліваюцца новыя сотні, тысячы, дзесяткі тысяч пролетарскае моладзі. Высокая і пачэсная назва комсамольца заваёўваецца юнымі пролетарыямі фабрык і заводаў ударнай работай па выкананьню і перавыкананьню прамфінпляну юнакамі саўгасаў-колгасаў—ударнай работай па социялістычнай рэконструкцыі сельскае гаспадаркі.

Агрэгаты, цэхі, брыгады, якія ўдарна працавалі і працуюць па выкананьню пляну, у сваёй большасьці ўжо акомсамолены. Акомсамолена рад буйных прадпрыемстваў Менску, Гомеля, Віцебску і іншых гарадоў. З кожным днём пашыраецца сетка комсамольскіх ячэек у колгасах.

Але як-жа абстаіць справа з падрыхтоўкай зьмены комсамолу, як комсамольская організацыя, разгортваючы работу па ператварэньню у шматмільённаю—змагаецца за шматмільённую зьмену,—за выхаваньне насьля кастрычнікаўскага пакаленьня?

Пастаноўка гэтых пытаньняў, асабліва зараз, набывае вялікае значэньне.

Праз некалькі дзён склікаецца другі ўсебеларускі зьлёт піонэраў.

Ня гледзячы на ўсю важнасьць і значаньне, якую зьлёт павінен будзе адыграць у гісторыі дзіцячага комуністычнага руху Беларусі,—падрыхтоўка да зьлёту ў радзе раёнаў (Менскі, Віцебскі, Койданава) не забясьпечвае выказаньня задач, пастаўленых перад ім ЦК КП(б)Б і ЛКСМБ.

Падрыхтоўка да зьлёту ня ўвязваецца з вярбоўкаю пролетарскае дзетвары ў піонэрскую організацыі з організацыяй новых піонэрскіх атрадаў.

Больш таго, з боку асобных комсамольскіх організацый нагіядаецца опортуністычная недаацэнка ролі піонэрорганізацыі ў социялістычным будаўніцтве. Менавіта ў выніку опортуністычнай недаацэнкі з боку колектыву фабрыкі „Везуві“ (Гомель) піонэрскі атрад на фабрыцы „Везуві“ не працуе з часу спыненьня занятак у школе. З гэтай-жа прычыны на фабрыцы „Дзьвіна“ (Віцебск) вылучаюцца непадрыхтаваныя і не падыходзячыя на піонэрработу комсамольцы. І, нарэшце, надзвычайна абураючы факт, калі піонэраў (у Віцебску) „выстаўлялі“ з клюбу будаўнікоў праводзіць занятні ў калідоры.

Аздаравіцельная, масава-выхаваўчая работа сярод піонэраў, работа па ператварэньню піонэрорганізацыі ў шматмільённую—не разгорнута. Гэты незаплачаны рахунак ударнай работы павінен быць тэрмінова з комсамолу сьпісаны.

Мы павінны ні на хвіліну не забываць, што клясавы вораг зараз, як ніколі, вядзе шалёную барацьбу за моладзь, за дзетвару, за распаўсюджваньне свайго, варожага нам уплыву.

Другі ўсебеларускі зьлёт піонэраў павінен быць адзначаны ўсімі без выключэньня комсамольскімі і піонэрскімі організацыямі Беларусі разгорнутай масавай работай па ператварэньню піонэрорганізацыі ў шматмільённую.

Неорганізаваная дзетвара рабочых, батрачата, дзеці батракоў піонэрскага ўзросту павінны быць абавязкова на 100 проц. уцягнуты ў піонэрорганізацыі не пазьней, як да 17 МЮД'у.

Ячэйкі саўгасу, колгасу, пры якіх ня існуюць яшчэ піонэрскія атрады павінны безадкладна разгарнуць работу па організацыі іх.

У непасрэдную работу па ператварэньню піонэрорганізацыі ў шматмільённую праз організацыю масавай работы павінны быць уцягнуты таксама ўсе піонэры.

Упартай і настойлівай работай шматмільённаму ленінскаму комсамолу мы павінны падрыхтаваць надзейную шматмільённую зьмену.

На піонэр-работу вылучыць лепшых комсамольцаў

Піонэр-організацыі Межаўскага сельсавету, Аршанскага р-ну, яшчэ не пачалі падрыхтоўчай працы да 2-га ўсебеларускага зьлёту піонэраў. Работа піонэр-атраду, пры саўгасе Межава, які налічвае ў сваім складзе 47 чалавек, знаходзіцца ў занядбане. Комсамольская ячэйка ня цікавіцца работай атраду. Важаты атраду слаба працаваў, ячэйка за яго працай не сачыла.

Ня лепш абстаіць справа і ў саўгасе „Казечкі“, дзе атрад ужо год і два месяцы перастаў існаваць, аб чым сэкратар ячэйкі нават і ня ведаў.

Шмат піонэраў пакінулі атрады з-за адсутнасьці ў іх работы. Атрады не забяспечаны сталымі кіраўнікамі. Кіраўнікі, якія вылучаюцца ячэйкамі, працуюць вельмі мала ў атрадах і ня імкнуцца зацікавіць піонэраў работай у атрадзе.

Будаўнік

Вопыт лепшых—адстаючым

Большасьць атрадаў г. Віцебску ў падрыхтоўцы да 2-га ўсебеларускага зьлёту піонэраў аказваюць поўную бязьдзейнасьць.

У такой буйнай базе Віцебску, як „Дзьвіна“, пытаньне аб зьлёце яшчэ не стаяла на абвестцы дню атраду. Важаты базы ў атрадзе бывае вельмі рэдка. Кіраўніцтва з боку комсамольскай ячэйкі зусім слабае. Вылучаныя важатыя, з піонэрработай не знаёмы. У падрыхтоўцы да зьлёту фабком і парткалектыў ніякага ўдзелу ня прымаюць. Яны нават ня вылучылі сваіх прадстаўнікоў у комісію па падрыхтоўцы да зьлёту.

Ня лепш стаіць справа ў базе швэйнай фабрыкі „Сьцяг індустрыялізацыі“.

Адпак, ёсьць і такія атрады, якія сапраўды ўзяліся за падрыхтоўку да зьлёту. Да гэтых атрадаў адносіцца база панчошнай фабрыкі „Чырвоны Мэталісты“. Піонэрамі праводзяцца гутаркі па прадпрыемствах сярод рабочых аб зьлёце. Вывешваюць дошкі з вырэзкамі з газэт аб зьлёце, на гэтай-жа дошцы зьмяшчаецца матар'ял аб становішчы базы, аб кіраўніцтве з боку комсамольскай ячэйкі і інш. Іх прыкладу павінны пасьледваць усе астатнія атрады Віцебску.

Брыгадзір „Ч. З.“ Ваўчок.

Організаваць пры кожным колгасе піонэр-атрад

У Машанацкім сельсавеце, Магілеўскага р-ну ня маецца ніводнага піонэр-атраду. А між тым у гэтым сельсавеце ёсьць шмат дзяцей жадаючых стаць піонэрамі. Комсамольская ячэйка павінна зьвярнуць на гэта ўвагу і організаваць у гэтым сельсавеце пры колгасах піонэр-атрады.

Зуеў

Партыйныя і комсамольскія яч.—у баку

Лядненскі РК КП(б)Б і РК КСМ своечасова абгаварылі пытаньне аб падрыхтоўцы і правядзеньні раённага зьлёту піонэраў. Сваю пастанову яны разаслалі па ўсіх партыйных і комсамольскіх ячэйках, але яна апошнімі ня выконваецца. Комсамольцы лічуць, што гэты зьлёт іх не датычыцца. РБ ДКО даручыў некаторым комсамольцам, сябрам РБ выехаць у раён, дапамагчы там на мясцох падрыхтавацца да зьлёту, але яны адмовіліся паехаць.

Такія нядбайныя адносіны ёсьць і з боку партыйных ячэек. Яны зусім забываюць, што існуюць піонэры. Так, у большасьці ячэек сэкратары, робячы справаздачы нічога не гаварылі аб піонэрах, таксама гэта нагляделася ў шмат якіх комсамольскіх ячэйках.

Назначана было адчыніць лягер на 1-е ліпеня, але комсамольскія ячэйкі не дапамаглі ў гэтай справе піонэрам і таму лягер быў адкладзен.

Юнкор Крупецкая.



ЦК ЛКСМБ і яго баявому органу „Чырвонай Зьмене“

Другі раённы зьлёт піонэр-організацыі Рагачоўшчыны шле палкае ленінскае прывітаньне ЦК ЛКСМБ і яго баявому органу—„Чырвонай Зьмене“.

Раённая піонэр-організацыя, пад кіраўніцтвам раённай партыйнай і комсамольскай організацыі, актыўна змагалася за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, колектывізацыі і веснавой пасеўнай кампаніі.

Сіламі піонэраў дадзена колгасам 8908 працадзён, 150 рацыяналізатарскіх прапаноў, уцягнута у колгасы 25 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, уцягнута ўкладчыкамі ў ашчадкасы на суму—723 р., рэалізавана пазыкі „3-ці рашаючы год пяцігодкі“ на суму—3000 р., озэтлётарэя на суму—1078 р. пасаджана 26 га лесу, ачышчана 130 га саду, пратручана 4048 кгр. насеньня, організавана і абслужана 37 лікпунктаў і інш.

Раённы зьлёт піонэр-організацыі запэўняе ЦК ЛКСМБ і яго баявы орган „Чырвоную Зьмену“, што піонэр-організацыя, як і раней, пад кіраўніцтвам парт—і КСМ—організацый будзе яшчэ больш рашуча змагацца за выкананьне задач будаўніцтва социялізму ў нашай краіне.

Няхай жыве ленінскі ЦК ЛКСМБ і яго баявы орган—„Чырвоная Зьмена“,

Прэзыдыум райзьлёту.

Буду актыўным комсамольцам

Я, піонэр В. Лебядзеўка, Кармянскага р-ну, нядаўна паступіў у Янаўскую ячэйку КСМ. Гэта ячэйка абслугоўвае шэсьць колгасаў Курганіцкага сельсавету. Яна організавалася тры тыдні таму назад.

Перад уноў організаванай ячэйкай пастаўлена вялікая задача—уцягнуць усю лепшую частку колгаснай моладзі ў комсамол. Таму я абавязуюся; да ХУІІ МЮД'у ўцягнуць 10 колгасьнікаў у рады комсамолу.

Выклікаю пасьледваць майму прыкладу комсамольцаў Янаўскай ячэйкі: Кротава, Уласенка, Васіленку, Цімохавых П. і Ян., Гомэрава і Кевлеву.

Я. Герасіменка.

Клюбныя бюрократы выганяюць піонэраў з клюбу

Клюб „Парыскае Комуны“ (Віцебск) аб'ядпае 6 прадпрыемстваў. У клюбе займаецца толькі адзін атрад піонэраў абутковай фабрыкі імя Лекерта, адпак, часу для заняткаў у клюбе адпускаецца вельмі мала.

Яшчэ горш абстаіць справа ў клюбе будаўнікоў. Ён амаль зусім не абслугоўвае піонэр-атрады. Былі, нават, выпадкі, калі іх выганялі на вуліцу і ім прыходзілася праводзіць занягкі ў калідоры.

Юнкор-пост Усыскін і В-к.

За апэрацыйнасьць, конкрэтнасьць і праверку выкананьня

ПАРТОРГАНІЗАЦЫІ НЕПАСРЭДНА АДКАЗВАЮЦЬ ЗА СТАНОВІШЧА РАБСЕЛЬКОРАЎСКАГА РУХУ

Бязьлітасная барацьба з скажэньнямі партыйнай лініі ў рабоце з рабселькорамі і кіраўніцтве імі

З дакладу тав. Курціка аб задачах рабселькораўскага руху, парткіраўніцтва ім і ўдарніцтва ў друку

Калі мы па раду важнейшых галін нашай прамысловасьці маем датэрміновае выкананьне пяцігадовых плянаў, дык мы маем магчымасьць сёньня, на ўсебеларускім зьезьдзе рабселькораў паведаміць аб тым, што і наш „газэтны прамфінплян", што і пляны газэтнай продукцыі БССР на сёньня таксама „перакрылі" плянавыя меркаваньні ўсёй пяцігодкі на 156 проц.

Калі ў 1924 г. мы мелі ў БССР 2 тысячы рабселькораў, дык зараз па самых мізэрных падліках, мы маем на Беларусі 40.000 рабочых, сялянскіх і вайсковых корэспондэнтаў—адданых памоцнікаў комуністычнай партыі, барацьбітоў за яе генэральную лінію.

Рэконструкцыйны пэрыод, пэрыод разгорнутага па ўсім фронце соцыялістычнага наступленьня, выклікаў да жыцьця, акрамя дзесяткаў тысяч насьценных газэт, тысячы друкаваных фабрычна-заводзкіх, саўгасных і колгасных шматтыражак і сотні раённых друкаваных газэт.

Між тым у нас, у БССР, пры вялізарным уздыме актыўнасьці рабселькораўскай масы, мы да апошняга часу мелі нездавальняючае кіраўніцтва рабселькораўскім рухам, амаль поўную адсутнасьць сыстэматычнага партыйнага кіраўніцтва нізавым друкам і рабселькораўскім рухам у радзе раёнаў БССР з боку раду раённых камітэтаў партыі, з боку часткі цэнтральных газэт і досыць значнай часткі раённых газэт БССР.

Апошнія 4—5 месяцаў зьявіліся для БССР месяцамі настойлівай, паглыбленай і разам з тым масавай работы па перабудове, пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б, рабселькораўскага руху.

Чатыры месяцы падрыхтоўкі да ўсебеларускага зьезду рабселькораў зьявіліся ўсім сваім „нутром", усёй „сэрцавінай" месяцамі работы па непасрэднай практычнай перабудове рабселькораўскага руху ў суадпаведнасьці з задачамі, пастаўленымі ў пастанове ЦК УсеКП(б) і пастанове ЦК КП(б)Б, а таксама ў пастановах апошняй усесаюзнай нарады пры „Праўде".

Замацаваць і разгортваць посьпехі

Але той факт, што толькі за апошнія 4 месяцы мы, як належыць, пачалі завастраць увагу на пытаньнях рабселькораўскага руху прымушае нас надзвычайна цьвяроза падыходзіць да ацэнкі нашых посьпехаў, якія зьяўляюцца толькі першымі крокамі і якія патрабуюць грунтоўнага, сыстэматычнага замацаваньня і свайго далейшага, зноў такі сыстэматычнага разгортваньня.

Асноўнае, што характарызуе рабселькораўскі рух на сучасным этапе соцыялістычнага будаўніцтва—гэта далейшы магутны ўздым усяго рабселькораўскага руху, уздым пад кіраўніцтвам партыі, ролі рабселькораў, як організатараў мас для справы соцыялістычнага будаўніцтва, выкананьне вытворчых плянаў і разгорнутага наступленьня на клясавых ворагаў. „... Гэтыя посьпехі дасягнуты наперакор спробам т. Бухарына і ін. дэзарыентаваць рабселькораў сваімі опортуністычнымі ўстаноўкамі аб прычынах клясавай барацьбы, прыродзе бюрократызму, аб тэрмінах індустрыялізацыі, колгасным і саўгасным будаўніцтве і г. д. Наперакор спробам змазаць палітычныя задачы рабселькораў і абмежаваць задачы рабселькораў голым „культурніцтвам",—роляю інформатараў, пасыўных адбівацеляў настрояў і г. д.—Рабселькораўскі рух рос, як грамадзка палітычная сіла" (з пастаноў усесаюзнай нарады па пытаньнях рабселькораўскага руху пры „Праўде").

Мы, бачым, што цэнтральнай фігурай рабселькораўскага руху становіцца рабкор-ударнік, таксама як на нашых прадпрыемствах цэнтральнай фігурай стаў рабочы—ударнік.

Тав. Стэцкі—загадчык культпропам ЦК УсеКП(б)—у адным з сваіх дакладаў асабліва падкрэсьлівае: „рабселькор—гэта організатар мас, у гэтым яго галоўнае значаньне". Нездарма мы зараз гаворым аб сувязі рабселькораўскага руху з ударніцкім рухам, аб тым, што „кожны ўдарнік павінен быць рабселькорам" і „кожны рабселькор павінен быць ударнікам". Гэта характарызуе тое новае, што ёсьць зараз у рабселькораўскім руху.

Паасобныя, часам шматлікія факты скажэньня ўстановак партыі ў пытаньнях рабселькораўскага руху ні ў якім разе не павінны затушоўваць той вялізарнай работы, якую зараз наша КП(б)Б пад кіраўніцтвам цэнтральнага комітэту партыі праводзіць у справе практычнага ажыцьцяўленьня пастаноў ЦК задачы, што ўся партыйная організацыя ў цэлым, кожная партыйная ячэйка паасобку нясе непасрэдную адказнасьць за становішча рабселькораўскага руху, нізавога друку, што справа кіраўніцтва нізавым друкам і рабселькорамі зьяўляецца састаўной адказнай часткай агульнапартыйнай работы.



Брыгады—вядучае зьвяно

Брыгады друку ні ў якім разе не павінны ізаляваццa ад астатняй масы рабселькораў. Яны павінны быць вядучым зьвяном усяго рабселькораўскага руху.

Ужо зараз ёсьць факты апашленьня ўдарных брыгад друку, калі адзін рэдакцыйны працаўнік падпісваецца, як ударная брыгада і г. д. і г. д.

Скажэньнем прынцыпу стварэньня ўдарных брыгад друку, трэба таксама лічыць спробы організоўваць брыгады сталым складам удзельнікаў.

„На заводах, у цэхах, усе ўдарнікі друку, у рабоце якой-бы газэты яны ня прымалі ўдзел, групуюцца вакол рэдколегій нізавых (цэхавай, заводзкай, колгаснай і г. д.) газэт" (з пастановы ўсесаюзнай нарады).

У некаторых цэнтральных і асабліва раённых газэт БССР, ёсьць дзяляцкі, в зка-спажывецкі падыход да ўдарных брыгад, да ўсёй масы рабселькораў, як да выключна пастаўшчыкоў матар'ялаў, ёсьць „абязьлічка" ў рабоце з рабселькорамі. У радзе асобных месц наглядаюцца ножніцы паміж бязупынным ростам ударных брыгад друку, ростам усяго рабселькораўскага руху ў цэлым і надзвычайна нездавальняючымі якаснымі паказчыкамі сыстэматычнай, выхаваўча-палітычнай работы з удзельнікамі брыгад.

Наш зьезд у сваіх пастановах і ў справах павінен надзвычайна разгорнута, глыбока і ўдумліва застанавіцца на пытаньні работы з рабселькорамі-адзіночкамі.

Умець злучаць работу ўдарных брыгад друку з работай сярод рабселькораў-адзіночак у адно неадрыўнае цэлае, з работай па далейшым уздыме рабселькораўскага руху на вышэйшую ступень—у гэтым адна з нашых асноўных задач.

Рэволюцыйнай дзелавітасьцю прасякнуць усю работу

Рэволюцыйная дзелавітасьць, барацьба з парадным шумікай, з „барабанным боем" павінна і на далей прасякаць сабою усю работу па перабудове рабселькораўскага руху і нізавога друку.

Словы „парадная шуміха", „барабанная трасканіна", „невыкананьне самага звязанага пастановы"—павінны быць адным з паняцьцяў у слоўніку рабселькораў. Рабселькоры-ўдарнікі друку павінны гэтым самым быць і ўдарнікамі жорсткай пасьлядоўнай і настойлівай праверкі выкананьня. Наш лёзунг—кожнае ўзьнятае газэтаю мерапрыемства, кожнае пастаўленае мерапрыемства—даводзіць да канца.

Апошняя прамова тав. Сталіна—гэта баявы „прамфінплян" і для ўсяго нашага друку і рабселькораўскага руху. Зьмест газэт, зьмест работы з рабселькорамі павінен быць перакладзены на вытлумачэньне новых задач, пастаўленых т. Сталіным і пастановамі апошняга пленуму ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б.

Перабудоўваючы ўвесь рабселькораўскі рух пад адзнакаю барацьбы за конкрэтныя задачы соцыялістычнага будаўніцтва, пад адзнакаю опэрацыйнасьці, спэцыялізацыі і дыфэрэнцыраванага падыходу да работы, мы павінны пры кожнай праверцы апалітычнага дзеляцкага падыходу матар'ялаў процістаўляць „рэволюцыйнай дзелавітасьці і ідэйную прынцыповасьць бальшавікоў, якія падначальваюць усю сваю работу, усе конкрэтныя справы інтарэсам клясы, партыі і сусьветнай пролетарскай рэволюцыі".

Мы ў БССР усё яшчэ значна адстаем з практычным ажыцьцяўленьнем задачы, якая пастаўлена ЦК УсеКП(б) аб тым, каб у кожным колгасе, у кожным саўгасе, МТС і населеным пункце рэгулярна выходзіла насьценгазэта.

Далёка не ва ўсіх нашых прадпрыемствах Беларусі ёсьць насьценгазэты. У радзе прадпрыемстваў, дзе ёсьць цэхавыя газэты, дык яны выходзяць ад урачыстасьці да урачыстасьці, ад сьвята да сьвята.

Задачы раённых газэт

„Бязумоўным лёзунгам раённых газэт зьяўляецца павярнуцца тварам да экономікі раёну. Раённыя газэты павінны забясьпечыць конкрэтнае кіраўніцтва і дапамогу ў рабоце нізавога друку і рабселькораўскага руху. Адным з дзейсных форм кіраўніцтва, зьяўляецца сыстэматычнае зьмяшчэньне аглядаў нізавога друку на старонках раённых газэт, а таксама організацыі зьлётаў і курсаў селькораў асобных колгасаў, саўгасаў, асобных галін сельскае гаспадаркі і г. д. (З пастановы ўсесаюзнай нарады).

Мы, таварышы, за апошнія 4 месяцы прарабілі некаторую, больш-менш значную работу ў пытаньнях рабселькораўскага руху. Але ні ў якім выпадку ў нас не павінна быць, „галавакружэньня ад посьпехаў". Зроблены толькі першыя крокі—уся работа ў далейшым, галоўнае—уперадзе. Жорсткай, пасьлядоўнай праверкай выкананьня, стварэньнем новых газэт, узмацненьнем існуючых, павялічэньнем колькасьці рабселькораў, ператварэньнем ударных брыгад друку ў вядучае зьвяно друку, узмацненьнем увагі да рабселькора-адзіночкі—замацуем нашы дасягненьні.

Кіраваць дзяржплянам ля варштату

Каштоўная ініцыятыва комсамольцаў Дзяржпляну


Ударная плянава-апэрацыйная ў цэху

Удзел комсамольскай організацыі і ўсяе працоўнае моладзі ў плянаваньні ўжо перастаў быць спробай адзінак, асобных груп комсамольцаў. Плянава-опэрацыйны рух ужо стаў шырока разгорнутым масавым рухам удзелу ленінскага комсамолу ў плянаваньні.

Плянава-опэрацыйныя групы нарадзіўшыяся на шмат якіх заводах, фабрыках, ужо выйшлі з стану першапачатковых спроб.

Плянава-опэрацыйныя групы першыя і конкрэтныя організатары масавага ўдзелу ў складаньні генэральнага пляну.

Далейшае разгортваньне і якаснае ўзьняцьце плянава-опэрацыйнага руху высоўвае большыя запатрабаваньні, *патрэбна сталага кіраўніцтва, падагульненьне вывучэньне маючагася вопыту працы* плянава-опэрацыйных груп.

Надзвычайна каштоўна пачынаньне комсамольскага колектыву Дзяржпляну, які організоўвае сталую консультацыю для плянава-опэрацыйных груп.

Праца консультацыі не павінна быць абмяжована вузкімі рамкамі як па колькасьці ўдзельнікаў, так і па колькасьці разглядаемых пытаньняў.

Праца консультацыі павінна стаць неадрыўнай часткай усяго плянава-опэрацыйнага руху, яна павінна стаць, пры ўдзеле ўсяго комсамолу і працоўнае моладзі,—плянава-опэрацыйнай групай плянавага руху.

Слухай, плянавік варштату!

З 17-га ліпеня бюро комсамольскага колектыву Дзяржпляну наладжвае консультацыю плянава-опэрацыйных груп.

Консультацыя ўтвараецца ў Дзяржпляне (пляц. Волі, д. 5, 3-ці паверх, пакой № 18) штодзённа ад 6 да 8 гадзін ув.

Бюро комсамольскага колектыву ЛКСМБ Дзяржпляну.

Старт дадзены—хто першым прыйдзе да фінішу

Штурмуючы прарывы ў падпісцы на „Чырвоную Зьмену", ячэйкі павінны змагацца за пераходны сьцяг

Праводзімы двухмесячнік штурму давядзеньня тыражу „Чырвонай Зьмены" да шасьцідзесяці тысяч экзэмпляраў да гэтага часу ня даў належнага зруху па ўнядрэньню „ЧЗ" у гушчу працоўнае моладзі.

Асобныя камітэты комсамолу не надалі політычнай важнасьці пытаньню распаўсюджваньня сваёй комсамольскай газэты. і тым самым ігнаруюць пастанову X зьезду комсамолу Беларусі аб тым, каб „кожны комсамолец чытаў сваю газэту „Чырвоная Зьмена".

Разам з гэтым трэба адзначыць, што зрыву двухмесячніку спрыяе тое, што раённыя паштовыя аддзяленьні працуюць з рук вон дрэнна. У цэлым шэрагу раёнаў, газэты атрымоўваюцца з вялікім спазьненьнем па 10-12 нумароў у месяц, не зьвяртаючы ўвагі на тое, што аб гэтым ганебныя зьявішчы ўжо ня раз сыгналізавала газэта.

Паштовыя раённыя аддзяленьні да гэтага часу не перабудаваліся ў сваёй працы, не зразумелі тую вялікую політычную ролю, якую зараз, у трэцім рашаючым годзе, адыгрывае друк.

Больш увагі „Чырвонай Зьмене"

Дараганаўская ячэйка ЛКСМБ ня выконвае задач пастаўленых IX усесаюзным і X Усебеларускім зьездамі ЛКСМ аб тым, што ніводны комсамолец, ніводная ячэйка не павінна быць бяз сваёй комсамольскай газэты.

У Дараганаўскай ячэйцы ёсьць 35 комсамольцаў, а выпісваюць „Чырвоную Зьмену" усяго 10-12 чал. Таксама слаба разгорнута праца з „Чырвонай" сярод беспартыйнай моладзі. Праводзімы двухмесячнік не дайшоў да ячэйкі. Яшчэ і на сёньнешні дзень на ўвесь сельсавет выпісваецца 15 экз. „ЧЗ"-ня гледзячы на тое, што ў ім маецца шмат моладзі.

Трэба рашуча ўдарыць па такіх адносінах да распаўсюджваньня комсамольскага друку і паставіць працу так, каб кожны комсамолец і кожны беспартыйны чытаў „Чырвоную Зьмену"

Левіна Р.

Аб двухмесячніку „ЧЗ" ня ведаюць

Комсамольцы колгасу „Чырвоная Зорка" (Любаньскага раёну) аб двухмесячніку „Чырвонай Зьмены" зусім ня ведаюць. Ва ўсім колгасе не знойдзеш ніводнага экзэмпляра „Чырвонай Зьмены".

Комсамольскі колектыў да гэтага часу ня выконвае пастановы X-га зьезду ЛКСМБ аб „Чырвонцы". Бюро не зацікаўлена у тым, каб комсамольская і беспартыйная моладзь чытала сваю газэту

Двухмесячнік штурму „Чырвонай Зьмены" павінен узварушыць комсамольскую ячэйку колгасу „Чырвоная Зорка".

Вяроўка.

Замест 350—600

Бялыніцкі РК ЛКСМБ шырока абгаварыў пытаньне правядзеньня двухмесячніку „Чырвонай Зьмены" і высунуў сустрэчны плян. Замест кантрольнай лічбы ў 350 экз. „Ч.З." 600 „Піонэр Беларусі", замест—600 экз.1200.

Для правядзеньня двухмесячніку складзены штаб пры РК ЛКСМБ створана маладзёжная старонка пры раённай шматтыражцы.

РК ЛКСМБ выклікае на соцспаборніцтва Кармянскі раён.

Сэкратар РК Казлоў

Калі-ж мы будзем атрымоўваць рэгулярна газэты

Дастаўка газэт і часопісаў у Менску пастаўлена дрэнна. Рабочыя часта скардзяцца на тое, што пошта несвоечасова дастаўляе газэты.

Калі зварочваешся ў газэтнае бюро дык заўсёды атрымоўваеш такі адказ; „З сёньняшняга дню будзеце рэгулярна атрымоўваць газэты", гэты „сёньнешні дзень" і дагэтуль яшчэ ня прышоў. Асабліва кепска абстаіць справа з дастаўкай „Чырвонай зьмены".

Перад Менскім газэтным Бюро трэба паставіць пытаньне рашуча і патрабаваць адказу, хто вінаваты ў тым, што рабочы ня можа атрымаць своечасова газэту?

Неабходна склікаць нараду газэтнага бюро, лістаносцаў сумесна з падпісчыкамі і чытачамі газэт і высьветліць, хто зьяўляецца конкрэтным насіцелем гэтага зла?

Алесь Баравы.

СТАЛІНСКУЮ ФОРМУЛУ
У ЦЭХІ ДЛЯ ЗЬДЗЕЙСЬНЕНЬНЯ
Цэхі яшчэ не аўладалі гаспадарчым разрахункам

„Унярдыць і ўмацаваць гаспадарчы разрахунак, узьняць унутрыпрамысловае накапленьне—такава задача" (Сталін).

Мы ўжо пісалі аб недахопах у ажыцьцяўленьні гаспадарчага разрахунку на Менскай абутковай фабрыцы, дзе замест унядрэньня гэтай бальшавіцкай сыстэмы ва ўсю працу фабрыкі, замест шырокай растлумачальнай працы ў масах рабочых аб значэньні і шляхох конкрэтнага ажыцьцяўленьня гаспадарчага разрахунку, гаспадарчы разрахунак быў уведзены загадамі заводакіраўніцтва зусім офіцыйна.

Ня лепш праходзіць ажыцьцяўленьне гаспадарчага разрахунку на Магілеўскай швэйнай фабрыцы. Патрабаваньне аб пераводзе вузорнага маладзёжнага агрэгату на гаспадарчы разрахунак павінна быць выканана ў самы кароткі тэрмін.

Яскравым прыкладам няўменьня гаспадарчыць, ажыцьцяўляць асноўныя прынцыпы гаспадарчага разрахунку зьяўляецца факт, аб якім гавораць комсамольцы БЖС у адчыняным лісьце да наркома РСІ тав. Калніна.

Гэтае пытаньне павінна быць вырашана тэрмінова. Трэба прымусіць паказаныя ў лісьце гаспадарчыя органы сваячасова выконваць свае гаспадарчыя абавязкі. Фінансаваньне будаўніцтва не павінна быць сарвана.

Адчынены ліст Наркому РСІ т. Калніну

Тав. Калнін, наш комсамольскі колектыў будаўнікоў Белжылсаюзу вымушаны зьвярнуцца да вас з просьбаю, аказаць дапамогу ў вырашэньні некаторых пытаньняў працы Менскага аддзяленьня Будканторы БЖС.

Перабоі ў выкананьні будфінпляну, затрымка ў выплаце зарплаты рабочым, адсутнасьць зваротных сродкаў, што высьветлена нашымі брыгадамі, у значнай ступені залежыць ад вялікай запазычанасьці рознымі арганізацыямі аддзяленьню Будканторы.

Работы выкананы, зданы, а грошы ня ўплочаны. На сёньнешні дзень запазычанасьць розных організацый па будаўніцтву, аддзяленьню будканторы складае каля мільёну рублёў.

Вось прыклады:

1.	Дзіцячая клініка павінна ўплаціць за вытварэньне будаўнічых работ					3.316	руб.
2.	В. С. Н. Г.	„	„	„	„	11.843	„
3.	Ваенвед	„	„	„	„	36.706	„
4.	Дом адпачынку ў Прылуках	„	„	„	„	10.650	„
5.	Інстытут прамысловасьці		„	„	„	5.134	„
6.	Стадыён (ЦСПСБ) павінна		„	„	„	186.162	„
7.	Саўнарком Бел.	„	„	„	„	10.177	„
8.	Школа Профруху	„	„	„	„	3.883	„
9.	Профшкола краўцоў	„	„	„	„	789	„
10.	Р. С. І.	„	„	„	„	3.513	„
11.	ЖБКТ „Дзяржбанкавец"		„	„	„	778	„
12.	„ „Комвузавец"		„	„	„	77.890	„
13.	„ „Чырвоны Кастрычнік"		„	„	„	300.437	„
14.	„ „Комінтэрн" павінен		„	„	„	2.949	„
15.	„ „Сувязь"	„	„	„	„	11.206	„
16.	„ Працасьветы	„	„	„	„	13.829	„
17.	„ „1-е мая"	„	„	„	„	33.043	„
18.	„ „Іскра"	„	„	„	„	71.236	„
19.	„ Жакт № 2	„	„	„	„	2.117	„
20.	„ „ № 3	„	„	„	„	1.393	„
21.	„ „ № 5	„	„	„	„	32.160	„
22.	„ „ № 7	„	„	„	„	9.711	„
23.	„ „ № 10	„	„	„	„	931	„
24.	„ „ № 13	„	„	„	„	4.665	„
25.	„ „ № 16	„	„	„	„	6.463	„
26.	„ „ № 20	„	„	„	„	1.407	„
27.	„ „ № 22	„	„	„	„	23.124	„
				Усяго		844.612	„

Гэты сьпіс можа быць значна працягнуты.

Гэткае-ж становішча з запазычанасьцю ў адносінах ЖБКТ, да якіх Белжылсаюзам прымаюцца меры, але Белкомунбанк несваечасова выдае грошы, якія прылічваюцца з фондаў у пакрыцьцё запазычанасьці.

Усё гэта складае надзвычайна цяжкія ўмовы працы і пагражае ў некаторай ступені зрывам будаўнічых работ.

Ад імя ўсяго комсамольскага колектыву будаўнікоў Белжылсаюзу мы зьвяртаемся да вас, тав. Калнін, за дапамогаю ў гэтай справе, што дасьць нам магчымасьць пасьпяхова выканаць будаўнічы плян 3-га рашаючага году пяцігодкі.

Бюро колектыву ЛКСМБ Белжылсаюзу.

Маладзёжны агрэгат—на гаспадарчы разрахунак

Магілеў.—Магілеўская швэйная фабрыка імя Валадарскага формальна ўжо перайшла на гаспадарчы разрахунак. Заключаны дагаворы паміж цэхавай адміністрацыяй і дырэкцыяй фабрыкі. Але гэтыя дагаворы не абгаварваліся сярод рабочых, пытаньне ажыцьцяўленьня гаспадарчага разрахунку не ўвязвалася з агульнымі задачамі ўзьняцьця вытворчасьці працы, паляпшэньня якасных паказчыкаў, між тым якасьць продукцыі—адзін з найбольш хваробных вучасткаў працы фабрыкі.

Кантроль за выкананьнем дагавораў не ўстаноўлены. Рабочыя ня ўцягнуты ў працу па ажыцьцяўленьні гаспадарчага разрахунку. Зусім дрэнна крануша праца па заключэньню дагавораў з асобнымі брыгадамі, на вытворчых брыгадах і ў брыгадах дагавары на абтаваравіся.

Патрабаваньне аб неабходнасьці пераводу маладзёжнага агрэгата на гаспадарчы разрахунак, што магчыма і неабходна, бо агрэгат зьяўляецца прыкладным на фабрыцы, дагэтуль ня выканаы.

На фабрыцы ёсьць вялікія непатрэбныя запасы матар'ялаў (гузікі і інш.), што парушае фінансавае становішча фабрыкі.

Комсамольскі колектыў фабрыкі надзвычайна мала зрабіў для ажыцьцяўленьня гаспадарчага разрахунку ў вузорным маладзежным агрэгаце, а таксама і на ўсёй фабрыцы.

Фабрычныя організацыі павінны неадкладна выправіць памылку. Праца па пераводу фабрыкі на гаспадарчы разрахунак павінна стаць справай усяго рабочага колектыву фабрыкі.

Юнкораўская брыгада „Ч. З." Гарэлаў, Бакман, Халіпскі, Фонкац, Тылін.

Дамо краіне 1.600.000.000

УЗЯТЫЯ ТЭМПЫ—НЕ БАЛЬШАВІЦКІЯ
...самол павінен дабіцца поўнай рэалізацыі пазыкі на вёсцы



Брыгадзір комсамольскай брыгады мэханічнага цэху Бабруйскага дрэваапрацоўчага комбінату т. Росьлік. Падпісаўся на пазыку на 500р.

Выклікаем на соцспаборніцтва

Людзявідкая ячэйка ЛКСМБ (Жыткавіцкага р-ну) падпісалася на пазыку на суму 815 р. і ўзяла абавязак рэалізаваць яе сярод насельніцтва на суму 1800 р. Ужо організаваны тры агітбрыгады па рэалізацыі пазыкі.

Выклікаем на соцспаборніцтва ячэйкі „Ленінская Беларусь" і комуны імя Першага Мая.

Сэкратар ячэйкі ЛКСМБ Я. Гельфанд.

Комсамольцы вёскі бяруць бальшавіцкія тэмпы

Комсамольскі колектыў саўгасу „Негарэлае" правёў вялікую працу па рэалізацыі пазыкі "Трэці рашаючы". У выніку—усе комсамольцы падпісаліся на суму 1500 р.

Наперадзе цэхавая ячэйка рабочых сьвінарнікаў, якая дала 950 р.

Комсамольскі колектыў саўгасу „Негарэлае" выклікае на соцспаборніцтва на хутчэйшую рэалізацыю пазыкі комсамольскую ячэйку колгасу „Кухцічы"

Юнкор „Чырвонай Зьмены"

Паказалі прыклад

Комсамольская брыгада мэханічнай майстэрні Бабруйскага дрэваапрацоўчага комбінату ў колькасьці 10 асоб пры агульным месячным заработку ў 1160 р. падпісалася на пазыку на 1480 р. Брыгадзір Комсамольскай брыгады тав. Росьлік атрымлівае 150 р., на пазыку падпісаўся на 500 р. 27 комсамольцаў біржы піламатар'ялаў пры сярэднім месячным заработку ў 1715 р. падпісаліся на пазыку на 1895 р.

Комсамольцы белцэху падпісаліся на пазыку звыш 100 пр. месячнага заработку.

Юнкор „Ч. З." Ганкін.

Ліквідацыяй недахопаў—мацаваць посьпехі

Кантрольнае заданьне па рэалізацыі пазыкі „трэцяга рашаючага" па Гомельскай фабрыцы „Труд" выканана на 101,9 проц. месячнага заработку.

Крэвецка-загатовачны цэх у большасьці маладзёжны, які зьяўляецца вузорным у выкананьні прамфінпляну—вышаў першым і ў рэалізацыі пазыкі, перавыканаўшы заданьне на 4 проц.

Комсамольскі колектыў фабрыкі правёў вялікую растлумачальную працу. Значная колькасьць комсамольцаў і беспартыйнай рабочай моладзі падпісаліся па пазыку больш месячнага заработку. У штамповачным і монтажным цэхох усе комсамольцы падпісаліся на месячны заработак. Пашывачны цэх таксама выканаў заданьне з перавышэньнем.

Але ў працы па рэалізацыі пазыкі на фабрыцы ёсьць і буйныя прарывы. Частка комсамольцаў лічыла сваім абавязкам толькі падпісацца на пазыку і ня прымала ніякага ўдзелу ў масава-агітацыйнай працы. Быў выпадак, калі два комсамольцы адмовіліся падпісацца на пазыку.

Посьпехі неабходна замацаваць яшчэ большымі дасягненьнямі, дабіцца стопроцантнага ахопу ўсіх рабочых падпіскай на пазыку, яшчэ большага перавышэньня заданьня. **І Вул.**

* * *

Фабзавучнікі Віцебскага ФЗВ чыгуначнікаў падпісаліся на пазыку „Трэці рашаючы" на 5375 р. Падпіскай ахоплены ўсе 100 проц. фабзавучнікаў. **Юнкор Д. У.**

Комсамольскі паход працягнуты да 25 ліпеня

Сустрэць уборку падлічанымі працаднямі
Ніводнага колгасу—бяз зьдзельшчыны
НЯМА ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНЫ БЕЗ ДАКЛАДНАГА ЎЛІКУ ПРАЦАДЗЁН

Комсамольскі паход за правільную організацыю працы, за ўлік працадзён у колгасах працягнуты да 25-га ліпеня.

„Рэкорд" бязьдзейнічаньня наплявацельскіх адносін паказалі кіраўнікі Хоцімскай раённай організацыі і Барздынская ячэйка Заслаўскага раёну.

Безадкладна, без усялякіх прамядленьняў ў бліжэйшыя пяцідзёнкі да пачатку ўборачнай—перавесьці ўсе галіны працы колгасаў на зьдзельшчыну, скончыць улік ранейшай працы і кожнаму колгасьніку ўручыць працоўную кніжку!

Ня месца ў кіраўніцтве комсамольскіх організацый і ячэек, людзям, якія ня здольны ісьці ў ногу з сучаснымі ўдарнымі тэмпамі!

Барздынская ячэйка ў палоне опортунізму
Зьняць опортуністычнае кіраўніцтва

З 5-ці колгасаў, якія маюцца ў Барздынскім сельсавеце (Заслаўскі) раён ніводзін не пераведзены на сапраўдную зьдзельшчыну. У колгасах яшчэ пануе абязьлічка, не наладжаны ўлік працы. Палзёншчына ня выгнана з практыкі работы колгасаў.

Падрыхтоўка да ўборачнай кампаніі не разгорнута. У колгасе „Новае Жыцьцё" плян уборкі не абгавораны на пасяджэньні праўленьня і нават на сходзе. Рабочая сіла не разьбіта па брыгадах, дзякуючы чаму зрываецца правядзеньне ўборачнай кампаніі.

У сельсавеце маецца комсамольская ячэйка, але яна поўнасьцю бязьдзейнічае і ня цікавіцца працай колгасаў. Пытаньнямі ўнядрэньня зьдзельшчыны, настаноўкай уліку працы ячэйка не займаецца. Сакратар ячэйкі тав. Каноньчык на пытаньне,—як разгорнуты комсамольскі паход?—адказаў: „я аб гэтым першы раз чую і райком нам аб гэтым нічога не гаварыў".

У ячэйцы зьвіла сабе гнязло практыка правага опортунізму. З 12-ці комсамольцаў ячэйкі толькі тры колгасьнікі, астатнія яшчэ застаюцца аднаасобнікамі і ў колгас уступіць адмаўляюцца.

Райком не зварочвае ўвагі на гэтыя прарывы ў ячэйкі. Калі аб іх паведамлялі і прасілі дапамогу, дык райкомаўцы адмахнуліся: „нам няма часу, там вам відней".

Мы патрабуем ад райкому зараз-жа праверыць работу ячэйкі, выгнаць з комсамолу опортуністычных і зьняць опортуністычнае кіраўніцтва, якое зрывае правядзеньне ў жыцьцё важнейшых задач комсамолу.

Прыбытак Янка

Прапойшчына ўключылася

У правядзеньні комсамольскага паходу за ўлік працы і ўнядрэньне зьдзельшчыны ў колгасах, уключылася Прапойская комсамольская організацыя. Разасланы па сельсаветах брыгады профсаюзаў і комсамольскага актыву. Брыгады правялі па гэтаму пытаньню вялікую масавую работу ў колгасах. Разьбіўшыся на асобныя групы, прымацаваліся да колгасаў і разгарнулі работу па ўліку працы колгасьнікаў, запісу ў працоўныя кніжкі і выдачы іх на рукі.

Гароднэр Ільля.

Зрыўшчыкаў паходу Іоффэ і Турыка—да адказнасьці

У Хоцімскім раёне ні ў адным колгасе колгасьнікі не атрымалі працоўных кніжак. Колгас „Бавбік" (Хоцімскага раёну), налічвае больш 100 колгасьнікаў. Кніжкі з самага пачатку чэрвеня ляжаць у канцыляры пад замком. Ніякага вучоту ў працы колгасьнікаў не праводзіцца, што ўносіць блытаніну і рознымі недарочнасьці ў працы колгасьнікаў. Комсамольская ячэйка колгасу дагэтуль не займалася пытаньнем правядзеньня ўліку.

Бязьдзейнічае ўся раённая комсамольская організацыя. Сакратар райкому комсамолу тав. Іоффэ і культпроп тав. Турык нічога не зрабілі па правядзеньню комсамольскага паходу, за ўлік працы ў колгасах. Яны палітычна не дацэнілі гэтага найважнейшага пытаньня.

Райком партыі павінен прыцягнуць да партыйнай адказнасьці кіраўнікоў райкамолу, якія сваёй непадбайнасьцю і ігнараваньнем сарвалі правядзеньне паходу. Комсамольскі паход працягнуты да 25-га ліпеня. Наверстаць упушчанае і зараз-жа ўключыцца ў яго правядзеньне.

Г. Майсеянка.

НА АСНОВЕ ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНЫ І ЎЛІКУ РАЗЬВІВАЦЬ ТЭМПЫ УБОРКІ

На 17 ліпеня мобілізавана 5373 комсамольц.

Правільны ўлік ...уся ў 3637 колгасах

Працоўныя кніжкі даведзены да 82259 колгасьнікаў

ЯШЧЭ З БОЛЬШАЙ ЭНЭРГІЯЙ ЗМАГАЦЦА

за ўтварэньне моцнага вайскова-паветранага флёту

ПАМЯЦІ ЗАГІНУЎШЫХ ГЭРОЯЎ

ЗАГАД

Рэволюцыйнага Ваеннага Савету Саюзу Савецкіх Социялістычных Рэспублік

13 ліпеня 1931 г. № 9-2 *г. Масква*

12 ліпеня, адбываючы вучэбны палёт, трагічна загінулі пры аварыі самолёту заслужаныя баявыя камандзіры РСЧА— т. т. Трыандафілаў В. К.—намесьнік начальніка штабу РСЧА, Каліноўскі К. Б.—намесьнік начальніка кіраўніцтва механізацыі і моторызацыі РСЧА, Рыбальчук С. Т.—камандзір карабля, Баганаў В. С.—лётнік атраду асобага назначэньня, Шэндрыкаў А. Н. і Палавінкін С. Н.—авіяцыйныя тэхнікі, Аркадзьеў М. І.—памочнік начальніка сэктару кіраўніцтва штабу РСЧА Бялкоў Н. Н.—лётнік наглядальнік.

Чырвоная армія страціла восем выпрабаваных баявых камандзіраў, стойкіх барацьбітоў за справу рабочае класы. У іх ліку загінуў нам. начальніка штабу РСЧА тав. Трыандафілаў, самы выдатны таленавіты камандзір, адзін з буйнейшых опэрацыйных работнікаў, які настойліва руках напе-рад опэрацыйна-тэхнічнае мастацтва Чырвонай арміі. РВС Саюзу разам з усёй рабоча-сялянскай Чырвонай арміяй глыбока сумуе аб цяжкай страце.

Барацьбіты камандзіры і політработнікі! Сьхілім нашыя слаўныя баявыя сьцягі перад загінуўшымі таварышамі.

Будзем па-бальшавіцку ўпарта за высокія тэмпы і якасьць баявой падрыхтоўкі.

Яшчэ больш сьмела, рашуча і ўпарта пойдзем наперад для поўнага аўладаньня баявой тэхнікай авіяцыі і складанымі формамі бою.

Яшчэ з большай упартасьцю будзем умацоўваць узброеныя сілы першай у сьвеце пролетарскай дзяржавы.

Намесьнік народнага камісара па ваенных і марскіх справах і старшыні рэволюцыйнага ваеннага савету СССР

М. Тухачэўскі

Сотні, тысячы новых лётнікаў, інжынэраў—комсамольцаў

Шэф вайскова-паветраных сіл СССР—ленінскі комсамол разам з усёй рабоча-сялянскай Чырвонай арміяй выказвае свой глыбокі жаль па поваду цяжкай страты—пагібелі т. т. Трыандафілава, Каліноўскага, Рыбальчука, Баганава, Шэндрыкава, Палавінкіна, Аркадзьева і Бялкова. Запоўнім рады паветранага флёту сотнямі і тысячамі новых лётнікаў і інжынэраў-комсамольцаў.

Заклікаем усіх лётнікаў, інжынэраў, байцоў і камандзіраў падшэфнага вайскова - паветранага флёту і ленінскі комсамол яшчэ больш энэргічней змагацца за стварэньне магутнага вайскова-паветранага флёту СССР.

Цэнтральны Комітэт УсеЛКСМ

СНК--СССР сем'ям загінуўшых

Савет Народных Комісараў Саюзу ССР пастанавіў: для сем'яў т. т. Трыандфілава В. К., Каліноўскага К. Б., Рыбальчука С. Т., Шэндрыкава А. Н., Палавінкіна С. М., Бялкова Н. Н.—устанавіць пэнсію ў разьмеры поўнага месячнага акладу гэтых таварышоў.

Замежныя гасьцініцы, рэстораны і чыгунка ня прымаюць нямецкіх маракоў

БЭРЛІН. 14. Тут атрыманы зьвесткі, што гасьніцы і рэстораны, а таксама чыгуначныя шляхі за мяжой, адмаўляюцца прымаць нямецкія маркі. Нямецкія турысты вымушаны зьвяртацца за дапамогаю да нямецкіх пасольстваў.

У выніку закрыцьця банкаў і бірж спыніўся перавод грошай на граніцу, так як банкі і пошта ня прымаюць грашовых пераводаў.

Лейпцыгскія жандары сьледуюць прыкладу Гржэзінскага

БЭРЛІН. Па прыкладу Гржэзінскага, Лейпцыгскі начальнік паліцыі соц. дэм. Флейснер таксама забараніў правядзеньне дня беспрацоўя ў Лейпцыгу.

У дзень двухдзённіку трывогі

ЗМАГАЦЦА ЗА ПЕРАХОДНЫ СЬЦЯГ ЦК ЛКСМБ

Вышэй тэмпы падрыхтоўкі да навучальнага!

З 10-га ліпеня абвешчаны ўсебеларускі двухдзённік трывогі па нацкультбудаўніцтву. Але, ня гледзячы на тое, што прайшоў ужо тыдзень ні ў Менску, ні ў раёнах не адчуваецца належнага зруху ў справе сапраўды ўдарнай работы ў гэтай галіне.

Пасты „Чырвонай Зьмены" штодзённа дасылаюць трывожныя весткі, у якіх сыгналізуюць аб пагрозе, якая навісла над сваячасовым і паспяховым пачаткам новага навучальнага году.

У шмат якіх раёнах яшчэ нават не ведаюць аб двухдзённіку трывогі, абвешчаным ЦК ЛКСМБ, Наркамасьветы і ЦП Працасьветы.

Сакратарыят ЦК ЛКСМБ у сваей пастанове ад 10-га ліпеня 1931 году па дакладу Наркамасьветы аб падрыхтоўцы да навучальнага году абавязаў усе ГК і РК ЛКСМБ устанавіць сталы кантроль за сваячасовым выкананьнем заказаў для забясьпечаньня школ. І той раён, які лепш падрыхтуецца да сустрэчы новага навучальнага году, атрымае пераходны сьцяг ЛКСМБ.

Але ніводны ГК і РК ЛКСМБ яшчэ не ўстанавіў сталага кантролю за сваячасовым выкананьнем заказаў для забясьпечаньня школ. Ніводны ГК і РК ЛКСМБ не мобілізаваў, як належыць, як сапраўдны шэф усесаюзнага навучаньня раённую комсамолію, каб атрымаць пераходны сьцяг ЛКСМБ.

Колектыў друкарні Сталіна, ячэйкі БДВ, Белкоопсаюзу, Белдзяржвыдавецтва, Наркамасьветы і інш. не ўзялі пад асобны нагляд справу падрыхтоўкі да навучальнага году.

Так далей працягвацца ня можа. Павінен быць карэнны пералом у справе падрыхтоўкі да новага навучальнага году.

Мы чакаем ад гаркомаў і райкомаў ЛКСМБ, ад пастоў „ЧЗ", ад юнкораў, ударнікаў „кавалерыстых" вестак аб тым, як разгорнута ў іх раёне падрыхтоўка да навучальнага году, як комсамол уключаецца ў дзекадні трывогі, як разгортваецца змаганьне за пераходны сьцяг ЦК ЛКСМБ.

Самацёку нанесьці руйнуючы ўдар

Пастанова СНК БССР абавязвае Белкоопсаюз пры шырокім удзеле грамадзкасьці забясьпечыць школы гарачым сьнеданьнем, гарбатай, вопраткай і абуткам, але БКС да гэтага часу не мобілізаваў нізавыя коопэрацыйныя організацыі для патрэбнага ажыцьцяўленьня дырэктывы ўраду ў гэтай галіне.

Белкоопсаюз яшчэ не падрыхтаваны да сустрэчы новага навучальнага году, пытаньне аб падрыхтоўцы да новага навучальнага году яшчэ нават ня ставілася на паседжаньне праўленьня БКС. Асобныя кіраўнікі белкоопсаюзу кажуць:

—„Яшчэ не пасьпелі заняцца гэтым пытаньнем у сувязі з тым, што прайшла рэорганізацыя апарату. Мы яшчэ не ў курсе справы". Праўленьне БКС опортуністычна недаацэньвае важнасьці сваячасовай падрыхтоўкі да новага навучальнага году, за што сьведчыць факт, што да гэтага часу не далі ўказаньняў па гэтаму пытаньню асобным сэктарам і не ўстанавіла поўную адказнасьць за іх правядзеньне. Белкоопхарч да гэтага часу ня мае ніякіх зьвестак аб колькасьці школ, якія забясьпечаны харчаваньнем. Працаўнік гэтага аддзелу скардзіцца на тое, што ў гэтым ім не дапамагае Наркамасьветы. Зноў паўтараецца ківаньне Івана на Пятра. Белкоопхарч запатрабаваў ад нізавой коопэрацыйнай сеткі зьвесткі так аб становішчы грамадзкага харчаваньня, але большасьць нізавых коопэрацыйных організацый не адказалі на запытаньне. На няпрысылку зьвестак большасьцю спажыўтаварыстваў і ЦРК Белкоопсаюз не рэагаваў.

Організаваныя сталоўкі пры школах у большасьці сваёй не абсталяваны і адсутнічае мінімальная санітарыя.

Плянавае забесьпячэньне пад пагрозай

Па лініі БКС раёны павінны забясьпечваць падручнікамі, прыладамі і інш., але асобныя райінспэктары нарасьветы, ня гледзячы на тое, што тэрмін прадстаўленьня зьвестак аб патрэбнай колькасьці падручнікаў для школ раёну даўно прайшоў, да гэтага часу не даслалі БКС, што ставіць пад пагрозай зрыву ў гэтых раёнах плянавае забесьпячэньне падручнікамі і інш. навучальнымі прыладамі.

У Боркавіцкім, Ветрынскім, Заслаўскім, Лагойскім, Азарыцкім, Барысаўскім, Дрыбенскім, Лепельскім, Парыцкім, Полацкім, Прапойскім, Смалявіцкім, Сураскім, Сьвіслацкім, Вульскім і Чачэрскім раёнах інспэктары нарасьветы ня ведаюць колькі ім патрэбна падручнікаў. Але ні БКС, ні Наркамасьветы да гэтага часу не прыцягнулі да адказнасьці зрыўшчыкаў плянавага забесьпячэньня падручнікамі.

Ня лепш справа абстаіць са сваячасовым выданьнем падручнікаў і адпраўкай у раёны.

Калі прагледзець рэкомэндацыйны сьпіс Наркамсьветы, дык бачым, што з 24 падручнікаў, прызначаных да выданьня, усяго толькі 6 падручнікаў перасланы раёнам, астатнія яшчэ марынуюцца ў выдавецтве. Для школ 1-га концэтру, для школ 2-га концэртру падручнікаў накіравана ў раёны толькі 4, а падручнікі для лікпунктаў, для школ малапісьменных, вячэрніх школ ІІ- концэнтру, па вайсковай справе з 19—пасланы ў раёны толькі 5.

На гледзячы на тое, што ЦКК РСІ катэгорычна прапанаваў колегіі Наркамасьветы да 20—г. м. прадставіць коэфіцыент Белкоопсаюзу аб колькасьці патрэбнай дасылцы падручнікаў, якія маюцца ў складах НКА—апошні да гэтага часу вестак не прадставіў.

Відочных дапаможнікаў—няма

Яшчэ горш абставіць справа з падручнікамі для школ нацменшасьцяй. 27 яўрэйскіх падручнікаў і 11 польскіх яшчэ знаходзяцца ў выдавецтве і ў Наркамасьвеце.

БКС зусім ня ведае як вырашыць пытаньне з відочнымі дапаможнікамі, якія на сёнешні дзень зусім адсутнічаюць, а ў апошніх маецца вялікая патрэба (глёбус, карты СССР, Эўропы Беларусі і інш.)

Усё прыведзенае вышэй яскрава сьведчыць аб тым, што ў працы БКС адсутнічае сапраўдная бальшавіцкая праца па падрыхтоўцы да навучальнага году.

Стаўка на самацёк ставіць пад пагрозу сваячасовы пачатак навучальнага году.

Такія бясчынныя, яўна опортуністычныя адносіны некаторых адказных работнікаў Белкоопсаюзу і нізавой сеткі спажыўкоопэрацыі далей не цярпімы. Такімі тэмпамі ня сустрэнем падрыхтаванымі новы навучальны год.

Неабходна Белкоопсаюзу неадкладна ўключыцца ва ўдарную падрыхтоўчую працу да навучальнага году і выканаць ускладзеныя на яго задачы.

Райкомам комсамолу і комсамольскім ячэйкам неабходна таксама ўключыцца ў справу падрыхтоўкі да навучальнага году, узяць пад асобны комсамольскі нагляд працу ЦРК, райспажыўтаварыстваў, сельпо. і сачыць як яны рыхтуюцца да новага навучальнага году, як яны зябясьпечваюць пасьпяховую работу школ.

Ударная брыгада „Чырвоная Зьмена" Зысман, Семенцоў.

Польпэдтэхнікум усяляе трывогу

З наступнага навучальнага году Менскі польпэдтэхнікум пачынае працаваць па мэтоду проэктаў. Ня гледзячы на гэта праграмы, на аснове якіх выпрацоўваюцца проэкты для работы тэхнікуму, яшчэ марынуюцца ў мэтодкоме наркамасьветы.

З-за адсутнасьці плянаў у польпэдтэхнікуме ня ведаюць якіх і колькі патрэбна падручнікаў. Трэба адзначыць, што наогул у тэхнікуме падручнікаў на польскай мове ня маецца, акрамя політэкономіі і гісторыі партыі.

Вельмі дрэнна і з настаўнікамі. Настаўніка па ручной працы і політэхнізацыі, які-б ведаў машыназнаўства, абсталяваньне майстэрні—няма.

З рук вон дрэнна становішча з бытам студэнтаў. У інтэрнатах цесна. На 120 месц у інтэрнатах жывуць каля 200 чалавек. Памяшканьне пад пагрозай развалу. На рамонт адпушчана 10 тысяч рублёў, але будаўнічыя організацыі адмаўляюцца рабіць рамонт.

— У нас ёсьць больш сур'ёзныя справы—гавораць у Белдзяржбудзе.

Майстэрня, якая маецца пры тэхнікуме, не мэханізавана.

Набор у гэтым годзе павялічваецца ў два разы, а вызначаная колькасьць стыпэндыі застаецца тая-ж, што і ў мінулым новучальным годзе. У гэтым навучальным годзе ўсяго забясьпечана было толькі 55 проц. студэнтаў, а ў новым навучальным годзе і таго меней будзе. Аб усім гэтым пісалі ў Наркамасьветы, але вынікаў яшчэ да гэтага часу ніякіх няма.

З навучальным годам у Менпольпэдтэхнікуме становішча пагражаючае. Неабходна зараз-жа ў тэрміновым парадку адміністрацыі тэхнікуму і зацікаўленым у гэтым організацыям узяцца за рамонт памяшканьня, мобілізаваўшы ўсе ўнутраныя рэсурсы. Забясьпечыць студэнтаў інтэрнатам, сталоўкай і стыпэндыяй.

Гарком партыі, ЦК ЛКСМБ і НКА павінны зацікавіцца становішчам польпэдтэхнікуму. **Пост „Ч. З.". В. К.**

Сёньня 17-га ліпеня г. г., а 12-й гадзіне дню, на ўсебеларускім стадыёне кіно-брыгада Белдзяржкіно здымае масоўку для карціны „Юныя вынаходцы", прысьвечаная 2-му ўсебеларускаму Зьлёту піонэраў. Жадаючыя могуць удзельнічыць у здымках.

ЦБ ДКО ЦК ЛКСМБ

Кіно-брыгада імя газ. „Піонэр Беларусі".



У казармах „Сьвятой Кацярыны" ў горадзе Нансі, разьмешчаны 26 пяхотны „жалезны" полк, салдатам якога я зьяўляюся.

Склад палка, асноўны яго касьцяк—радавыя, у значнай большасьці—рабочыя, а склад вышэйшых чыноў арміі—чорнасоценцы, зьвязаныя сваім социяльным паходжаньнем і становішчам з фабрыкантамі і банкірамі. Пролетары французскай арміі і флёту—тыя-ж нявольнікі пад вынтоўкай. Колькі абураючых выпадкаў, забойства салдат афіцэрамі ведае гэтая армія! Колькі рэволюцыйных рабочых, папаўшых у армію, паклалі свае галовы ў дысцыплінарных турмах Кальві, Безансона, Мецо і катаргі Гвіаны. Зусім нядаўна ў 2-й сэкцыі броніраваных аўтомобіляў, у Эрфардзе, брыгадзір Брулон ударам прыклада забіў падначаленага салдата.

Французскі буржуазны друк старанна абыходзіць маўчаньнем усе гэтыя факты, баючыся, каб пра іх не даведаліся шырокія масы працоўных краіны.

Але вось, на днях, у нас у Нансі, адбыўся выпадак, аб якім вымушаны былі загаварыць нават і буржуазныя газэты. Маладых навабранцаў 26 палка пагналі ў самы сонцапёк—у 40—кілёмэтравы марш. Салдаты, якія кепска харчуюцца, стомленыя бясконцымі парадамі, ня вытрымалі цяжкага іспыту.

Адбылося гэта так. Камандзір 26-га палка,—палкоўнік Швэйгут, дамагаўся атрыманьня вайсковай узнагароды за „бяспрыкладны сонечны паход". Паход быў прызначаны на 9 гадзін раніцы, 11 чэрвеня, і павінен быў скончыца манэўрамі на плоскаў звышшы Рошэтт, каля Лейр, у 20 кілёмэтрах ад Нансі. Аднак, па загаду Швэйгута, адпраўка была перанесена на самы гарачы час дню—3 гадзіны.

„Т р э б а іх добра,—пратрэніраваць, гэтых маладых рабочых"—гаварыў Швэйгут. Пад моцным сонцапёкам, калёны накіраваліся ў паход. Салдаты ледзь цягнулі ногі. Афіцэры, якія ехалі вярхом на конях, не пакідалі патрабаваць „узмацненьня кроку". Некалькі салдат паваліласяся. Даведаўшыся аб гэтым, палкоўнік аддаў загад: „тыя, хто застануцца ў строю да канца паходу, атрымаюць 18-гадзінны адпачынак". Да маленькага прамысловага гарадку Менсевільля калёна дайшла. У Мансевільлі адбылося тое, чаго можна было чакаць раней. Больш 200 салдат паваліласяся. Жыхары разьбіралі няшчасныя ахвяры па сваіх кватэрах і прыводзілі іх у прытомнасьць. Афіцэры выпіхваліся з кватэр. Сонечны ўдар зрабіў сваю справу. 2 радавых памёрлі, ня прыходзячы ў прытомнасьць. 2 звар'яцелі. 62 у цяжкім становішчы зьмешчаны ў мясцовую больніцу.

Газэта комсамольцаў Францыі „Авангард", у нумары ад 20-га чэрвеня ў перадавым артыкуле „Далоў забойцаў з Нансі" выкрывае ў сувязі з адбыўшыміся ў Нансі здарэньнямі падрыхтоўку мілітарыстых да вайны з СССР.

„Трагічныя факты 26-га пяхотнага палка, піша газэта, зьяўляюцца, на жаль, уласьцівымі ўсёй буржуазнай арміі Францыі. Комсамол Францыі заклікае ўсіх юных пралетараў і салдат—аб'ядкацца для барацьбы супроць тых, хто кідае 20 міліярдаў франкаў на вайну супроць саветаў і не знаходзіць разам з гэтым ніводнага сантыму для дапамогі беспрацоўнай моладзі, супроць тых, хто. выплачваючы генэралам пэнсію ў 200000 франкаў, (каля 14.000 р.) ня лічуць магчымым плаціць салдатам болей за 5 су (дробная монэта), супроць тых, хто атрымлівае мільённыя прыбыткі і зьніжае заробчую плату рабочым, супроць тых, хто пакідае на волі забойцу–палкоўніка Швэйгута і садзіць у турму, у Мецэ, салдата Люцыані толькі за тое, што апошні быў сябрам французскага комсамолу".

Французская рабочая моладзь і салдаты вельмі абураны адбыўшымся ў Нансі. Моладзь яшчэ шчыльней згуртоўваецца дзеля абароны Савецкага Саюзу, рыхтуючыся да магутнай організацыі—1 жніўня супроцьваеннага дню.

Салдат 2-й роты А. Г.

г. Нансі. Казармы 26-га палка.

18-га ліпеня 1931 г. рўна а 5-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні Менгаркому ЛКСМБ склікаецца нарада ўсіх комсамольцаў, якія скончылі ў гэтым годзе сямігодку.

Пад асабістую адказнасьць сакратароў к-ваў і ячэяк прапануецца адзначаным комсамольцам зьявіцца ў Гарком.

Менгарком ЛКСМБ.

* * *

18-га ліпеня, а 7-й гадзіне ўвечары, у Гаркоме комсамолу адбудзецца нарада начальнікаў атрадаў лёгкай кавалерыі гораду Менску сумесна з актывам „ЛК".

Яўка—абавязкова.

Адказны рэдактар МІХ. ПЛАТАЎ.

Друкарня імя тав. Сталіна.

Галоўлітбел № 599